ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
3 СНЕЖНЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 24 (15783)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Уладзімір ПУГАЧ:

# «Я МОЦНА ЗАХАПІЎСЯ ЭКСПЕРЫМЕНТАМІ...»

## Гурт «J:Морс» можна назваць «доўгажыхаром» на нашай сцэне

**Калектыў запісвае альбомы, здымае кліпы, збірае аншлагі на канцэртах. Узнікае заканамернае пытанне: на чым трымаецца такі поспех? Адказ, магчыма, хаваецца ў тым, што адзін з яго стваральнікаў Уладзімір Пугач — рамантык па жыцці, які любіць свабоду і заўсёды шчыры ў сваёй творчасці. А ў пачатку лістапада ўбачыў свет новы альбом гурта — «Паветра»... Мы сустрэліся з Уладзімірам і пацікавіліся не толькі новым вынікам працы...**

**— Што адметнага адбылося ў вас асабіста і ў гурце за апошняе пяцігоддзе?**

— У 2010 годзе выйшаў альбом «Электрычнасць», потым мы зрабілі гастрольны тур па гарадах Беларусі, у пачатку і па завяршэнні якога сабралі Палац спорту. А потым я адчуў нейкую разгубленасць, бо не разумеў дакладна, куды рухацца далей. У 2011-2012 гадах мы аб'явілі, што прыпыняем студыйную працу, бо выступаем з канцэртамі, і так працягвалася да канца 2013 года. Многія ўспрынялі тыя нашы дзеянні як распад гурта. Сам заняўся сольным праектам пад назвай «Нафта». Праўда, тая праца не даведзена да канца, бо і я, і тыя музыканты, з якім мы рабілі матэрыял, занятыя пакуль што ў іншых праектах. Спадзяюся, з'явіцца час і распачатае мы давядзём да канца. І толькі калі я зразумеў, што ў мяне назапасіўся патэнцыял, каб рухацца з «J:Морс» далей — гэта быў сігнал нашай гатоўнасці запісваць новы альбом.

**— Склад групы неаднаразова змяняўся. На ваш погляд, такія перамены былі заўсёды карыснымі для калектыву?**

— Кожны раз такі крок мы рабілі з мэтай змяніць нешта да лепшага. Безумоўна, момант сыходу некага з «J:Морс» заўсёды непрыемны. Перш за ўсё, таму што даводзіцца вялікі пласт працы перарабляць, калі ўводзіш новага чалавека ў калектыў.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Андрэя КРАЎЧАНКІ.

Насуперак абставінам

# ДЗЯЎЧЫНА З БАЙЦОЎСКІМ ХАРАКТАРАМ

**Амалія Азацян, лейтэнант унутранай службы МНС, лічыць: чым больш трэба зрабіць, тым больш паспееш. Дзяўчына падарожнічае, любіць фатаграфаваць і чытаць, здымае невялікія фільмы, займаецца спортам, вывучае англійскую мову.**

**Яна і міністру пісьмо напіша,**
**калі ад гэтага залежыць,**
**ці збудзецца яе мара, і зробіць немагчымае магчымым... Галоўнае — мець невераготнае жаданне і настойлівасць.**

«Прафесар» — такая мянушка прыклеілася да Амаліі ў пачатковых класах з-за дрэннага зроку. Звычайныя акуляры насіць яна не хацела: аправа пастаянна нагадвала дзяўчынцы, што яна глядзіць на свет праз шкло, ды і рэчы бачыліся зусім іншымі... А вось у круглых, «бабуліных», — усё як на далоні! Ды і мянушка дзяўчынцы падабалася. Тым больш калі глядзела па тэлевізары гульню «Што? Дзе? Калі?» і ўсур'ёз задумалася: а ці не стаць знатаком? Пазней хацела стаць урачом, будаўніком, кухарам...

Спачатку Амалія вучылася ў Гудагайскай сярэдняй школе, а ў пятым класе перайшла ў Астравецкую гімназію №1. Здаецца, тады і вырашыла, што ваенная спецыяльнасць — яе мара. А паглядзеўшы расійскі серыял «Кадэцтва», адразу ж пачала высвятляць, ці ёсць у Беларусі сувораўскае вучылішча. Вядома — ёсць! Але Амалію чакала расчараванне — вучыцца там могуць толькі хлопчыкі...

— У школе я займалася і ў тэатральным, і ў валанцёрскім, і ў спартыўным гуртку, — дзеліцца Амалія. — Праўда, з апошнім былі праблемы: урачы заўсёды прызначалі мяне ў спецыяльную групу для заняткаў фізічнай культурай. І ніхто нават нічога не хацеў слухаць пра тое, што калі-небудзь я надзену вайсковую форму... Пасля 9 класа паступіла ў Гродзенскі ліцэй пры ўніверсітэце імя Янкі Купалы на фізіка-матэматычны профіль у... кадэцкі клас.



Напэўна, усмешка ніколі не сыходзіць з яе твару!

Тут амаль збылася мары пра ваенную кар'еру — дзяўчына хадзіла страявым крокам, страляла з вінтоўкі, нават з гранатамёта.

— Тады я дакладна і вырашыла — буду вайскоўцам. Пачала рыхтавацца, праглядала прахадныя балы на ваенныя спецыяльнасці — трэба было набраць іх не менш за 300. Разумела, што трэба шмат часу сядзець над кніжкамі, дадаткова займацца, каб атрымаць такі вынік. У ліцэі, вядома, весела, але рыхтавацца трэба было ўсё ж такі ў выкладчыкаў па матэматыцы і фізіцы, з якімі я займалася ў гімназіі, — успамінае дзяўчына. — Пакінуць кадэцкі клас, развітацца з формай, трэніроўкамі па каратэ было нялёгка. Але я ведала, што так трэба, каб аднойчы зноў апрануць форму, але ўжо афіцэрскую. І ў адзінаццатым клас вярнулася ў гімназію.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

Свой выбар

# ПЕРШЫ РАЗ, ПЕРШЫ КЛАС,

## або З пачынам, маладыя педагогі!

**Гэты верасень запомніцца як асаблівы і першакласнікам, і маладым спецыялістам, якія толькі распачалі настаўніцкую дзейнасць. Мы знайшлі сёлетніх выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта і папрасілі іх расказаць пра свае першыя тыдні працы ў школе.**

### Вясковая душа

Выпускніца гістарычнага факультэта Валянціна Шэшка паступала ў БДПУ з мэтавым накіраваннем і загадзя ведала, што пасля выпуску яе размяркуюць у Старадарожскі раён.

— За чатыры гады навучання ў сталіцы я дакладна зразумела: вялікі горад не для мяне. Я «вясковая душа». Таму ніякіх шкадаванняў ад таго, што еду сюды, не было, — расказвае дзяўчына. — Іншы момант, што ў Крываносах раней я ніколі не была. Перажывала з-за таго, як прымуць у калектыве. У выніку сустрэлі мяне цёпла, усе радаваліся, што да іх прыйшла такая маладая супрацоўніца. Увогуле, моладзі ў нас працуе мала: я, псіхолаг і бібліятэкар — астатнім за 35 гадоў.

Валянціна выкладае гісторыю ў 8—11 класах. Па словах суразмоўцы, агульную мову з падлеткамі яна знайшла хутка, а невялікая розніца ва ўзросце толькі паспрыяла гэтаму. Маладая настаўніца часта выкарыстоўвае мультымедыйны матэрыял на занятках: гэта і дзецям падабаецца, і ёй працу спрашчае.

— Вольны час па магчымасці праводжу з мужам, мы пабраліся шлюбам на пачатку верасня, але з-за працы пакуль жывём асобна, — прызнаецца Валянціна. — Увечары я звычайна сяджу за камп'ютарам. Бывае, лаўлю сябе на думцы, што не хапае шуму, толькі не гарадскога, а дзіцячага.

Пакуль настаўніцу ўсё задавальняе. Тут ёй нават часовае бясплатнае жыллё прадаставілі — цэлы прыватны дом, які знаходзіцца ў пяці хвілінах хады ад школы.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



«Інфармацыя на ўроку павінна быць візуальнай», — лічыць Генадзь Гапановіч.